Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Сярэдняя школа №15 г. Ліды”
Бібліятэка

# Залацінкі мудрасці народнай

*Беларускія прыказкі,
прымаўкі,
загадкі*



**Да Сусветнага дня
роднай мовы**

## *Прыказкі і прымаўкі пра Радзіму*

1. Родная зямелька – як зморанаму пасцелька.
2. На чужыне і камар загіне.
3. Чым за морам віно піць, лепш з Нёмана вадзіцу.
4. Далёкая старана без ветру сушыць.
5. У сваім краі, як у раі.

## *Прыказкі і прымаўкі пра прыроду*

1. Хмары не будзе – гром не ўдарыць.
2. Не ўсякая хмара дажджу дае.
3. Адкуль хмары, адтуль дождж.
4. Ластаўкі нізка лятаюць – дождж будзе.
5. Куры церабяцца і купаюцца – дождж будзе.
6. Будзе дождж – будуць і грыбы.
7. Як кот на пячы – холадна на двары.
8. Беражы нос у вялікі мароз.
9. Вада камень прабівае.
10. Якая зямля – такі і хлеб.
11. Колас добра не спее, калі сонца не грэе.

## *Прыказкі пра жывёльны і раслінны свет*

1. Ваўка зубы кормяць.
2. Воўка б’юць, а ён у лес бяжыць.
3. Воўк казе не таварыш.
4. Каза плача, а воўк скача.
5. Ліса і ў сне курэй бачыць.
6. Рыба вады не баіцца.
7. Якая птушка, такі і галасок.
8. Варона колькі не мыецца, усё роўна чорная, а гусь акунулася – і ўжо
9. Лес і вада – родныя брат і сястра.
10. Высокае дрэва здалёку відаць.
11. Дзе мухаморы, там і баравікі.
12. Дзе ягаднік, там і ягадабелая.

## *Прыказкі пра поры года*

1. Жураўлі ляцяць высока – зіма яшчэ далёка.
2. Жураўлі ляцяць нізка – зіма ўжо блізка.
3. Зімовы дзянёк, што камароў насок.
4. Якая зіма, такое і лета.
5. Зіма снежная – лета дажджлівае.
6. Бусел прыляцеў – вясна будзе.
7. Вясенні дзень год корміць.
8. Вясна красна цвятамі, а восень пладамі.
9. Калі май халодны, дык год хлебародны.
10. Хто халадку шукае, той узімку галадае.

## *Прыказкі пра сельскую гаспадарку*

1. На чорным полі бела пшаніца родзіць.
2. Дзе пасееш густа, там не будзе пуста.
3. Ліха не знаць – на сваім полі араць.
4. Гультая зямля не любіць.
5. Дзе гультай ходзіць, там зямля не родзіць.
6. Трэба рана ўставаці, калі хлеба дажыдаці.
7. Выходзь на поле з расою, дык будзеш з ядою.
8. У каго чорна глыба, у таго і хлеба скіба.

## Прыказкі пра працу

1. Шчырая праца – мазалёвая.
2. Хто любіць трудзіцца, таму без працы не сядзіцца.
3. Работа і корміць, і поіць.
4. Вось на свеце як бывае: хто працуе, той і мае.
5. Без працы не есці пірагоў.
6. Хочаш есці калачы, так не сядзі на пячы.
7. Хто працуе, таму і шанцуе.
8. Хто працуе, той і святкуе.
9. Добра рабі, добра і будзе.

## Прыказкі пра дзяцей

1. Кожнаму сваё дзіця міла.
2. Дзіцятка хоць і крыва, ды бацьку з маткаю міла.
3. Савіныя дзеці самыя харашэйшыя.
4. У сваёй маткі ўсе добрыя дзеткі.
5. Усякая матка хваліць сваё дзіцятка.
6. І ваўчыха сваіх дзяцей любіць.
7. І сава сваіх дзяцей хваліць.

## Прыказкі пра дабрыню, злосць і зайздрасць

1. Сам добры – людзі добрыя.
2. У добрага чалавека заўсёды многа добрых людзей.
3. Шчыраму сэрцу і чужая болька колка.
4. Добры чалавек і жывёлу шкадуе.
5. Злосці поўныя косці.
6. Верабей і той зло мае.
7. Сабака ад злосці свой хвост кусае.
8. Злы чалавек злее ваўка.
9. На ліхога чалавека і сабака брэша.
10. Чужыя лемяшы харашы.

## Прыказкі пра ляноту, гультайства

1. Працаваць не любіш – чалавекам не будзеш.
2. Праца чалавека корміць, а лянота порціць.
3. Да работы не пускаюць ляноты.
4. Лень жуе чалавека, як іржа жалеза.
5. Пачнеш ляніцца – будзеш з торбай валачыцца.
6. Ад ляноты чакай бядоты.
7. Гультаю ўсё цяжка.
8. Лянівай кабыле і хвост мяшае.
9. На работу – цяляты, а на яду – коні.
10. Верабей не сее, не жне, а зярняткі клюе.

## Прык

**азкі пра праўду і няпраўду**

1. На праўдзе свет стаіць.
2. За праўду стой гарой.
3. Чыя праўда, таго і сіла.
4. Праўды не скрыеш.

***Загадкі на беларускай мове***

- У маленькім гаршчочку смачная каша, ды зачэрпнуць цяжка. (Арэх.)
- Ляжыць сярод градкі зялёны і гладкі. *(Агурок)*
- Не рыба, а плыве, не конь, а ходзіць, не піла, а рэжа. *(Бабёр.)*
- Круглае, як сонца, гарыць пад ім донца; зарумянены бачок – шух на ручнічок! *(Блін).*
- Невялікі, рыжаваты,
  А хвост доўгі і калматы,
  На дрэве жыве і шышкі грызе. *(Вавёрка)*
- Без ног бяжыць*. (Вада.)*
- Ні рук, ні ног не мае, а яблыкі страсае*. (Вецер.)*
- Хоць малы ён, часам з кулак, але ў рукі не возьмеш ніяк. *(Вожык.)*
- Пад хвоямі, пад смолкамі,
  Па лясных дарожках
  Бяжыць клубок з іголкамі
  На кароткіх ножках. (*Вожык)*
- Круглае, гарбатае, вакол махнатае, як прыйдзе бяда, пацячэ і вада. *(Вока).*
- У адным доме сотні жыхароў, а сям'я адна. *(Вулей.)*
- Каляровае карамысла цераз рэчку павісла. *(Вяселка).*
- У адным клубочку ды сем дзірачак. *(Галава.)*
- Круглы хлявец поўны белых авец. *(Гарбуз.)*
- Зубастыя, а не кусаюцца. *(Граблі.)*
- З неба крупы падаюць. *(Град)*
- Паміж гор сядзіць Рыгор, капелюшом накрыты*. (Грыб.)*
- На градцы - доўгі і зялёны, а ў бочцы — жоўты і салёны*. (Гурок.)*
- З хаты ў хату водзіць, а сама не заходзіць. *(Дарога)*
- Мяне ўсе просяць,

Мяне чакаюць,
А як толькі з’яўлюся,
Хавацца пачынаюць. *(Дождж)*

- Што нас корміць, а есці не просіць? *(Зямля).*
- Сівенькая, маленькая, а ўвесь свет абшывае*. (Іголка.)*
- Доўгі насок, тонкі галасок, хто яго заб'е, тоЙ сваю кроў пралье. *(Камар.)*
- Што ляжыць, не павернецца. *(Камень)*
- Не куст, а з лісточкамі, не рубашка, а сшыта, не чалавек, а расказвае. *(Кніга.)*
- Кругленькі, маленькі, а за хвост не падымеш*. (Клубок.)*
- Касматы, вусаты, есці пачынае – песенькі спявае. *(Кот)*
- Ходзіць па двары, на нагах – купцюры, белае каменне нясе. *(Курыца)*
- Не агонь, а пячэцца? *(Крапіва).*
- Вярхом сядаю, на каго – не знаю, знаёмага ўбачу – адразу падскочу. *(Капялюш).*
- На вадзе родзіцца, а вады баіцца*. (Лёд.)*
- Вісіць — зялёны, ляціць — жоўты, ляжыць — чорны. *(Ліст.)*
- Са страхі морква вісіць, да зямлі не дастае, паху не мае, зімой вырастае*. (Лядзяш.)*
- Як вазьму цябе ў руку, трапна б'еш ты па цвіку. *(Малаток.)*
- Хоць зубоў не мае, а балюча кусае. *(Мароз.)*
- Дзядуля без сякеры мост пабудаваў. *(Мароз)*
- Паглядзі: вось гэта конь —
  Ярка-рыжы, як агонь.
  Лезе угору ён без стомы,
  Цягне бервяно для дома. *(Мурашка)*
- Каля сосен, каля ёлак
  Збудаваны дом з іголак.
  Можа, вам знаёмы ён?
  Жыхароў у ім мільён.
  Усе працуюць урачыста,
  Вось чаму навокал чыста. (Мурашнік)
- Не пытайся ў мамы —
  Сам гавары:
  Хто бегае над намі

Нагамі дагары? *(Муха)*

- Маленькі шарык пад лаўкай шарыць. *(Мыш)*
- Яго б'юць, а ён не плача. *(Мяч.)*
- Два кальцы, два канцы, а пасярэдзіне цвік. (Нажніцы.)
- Прыйшла чорная маці, усіх паклала спаці. *(Ноч)*
- Без станка, без рук, а кросны тчэ. (Павук.)
- Пяць братоў у адну ноч радзіліся, а ростам не роўныя. (Пальцы.)
- Кожны мае з вас, рабяты,<br>Верных сябраў па дзесятку,<br>Яны кормяць, апранаюць,<br>Працаваць дапамагаюць. *(Пальцы)*
- Не птушка, а за моры ляціць. *(Пісьмо)*
- Не сякера, а шуміць, не пілот, а ляціць, не змяя, а жаліць. (Пчала.)
- Жывы — чорны, памрэ — чырвоны. (Рак.)
- Вечарам нараджаецца, ноч жыве, а раніцай памірае. (Раса.)
- З неба ўпаў — усю зямлю, як абрусам, заслаў. (Снег.)
- Ляцяць птушкі без крыл, садзяцца без ног. *(Снег)*
- Маю рогі, маю ногі,<br>Я багаты і убогі —<br>Ля мяне ўсе сядаюць,<br>Дык скажы, як называюць? *(Стол)*
- Белы, як снег, салодкі, як мёд. *(Цукар)*
- Жоўты Піліп да палкі прыліп. *(Яблык)*